*УДК 398.3:61*

**К. С. Шаўцова**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# БЕЛАРУСКІЯ ЛЕКАВЫЯ ЗАМОВЫ: МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ

*Артыкул прысвечаны даследаванню беларускіх лекавых замоў, выяўленню іх прызначэння ў жыцці, характарыстыцы структурных кампанентаў гэтага віду абрадавага фальклору. Фактычную аснову артыкула складаюць тэксты замоў, запісаныя на тэрыторыі Гомельшчыны ў палявых экспедыцыях студэнтамі і выкладчыкамі ГДУ імя Францыска Скарыны і апублікаваныя на старонках зборніка "Гаючае слова роднай зямлі: беларускія лекавыя замовы"* [1].

Замовы – гэта славесныя магічныя тэксты, пры дапамозе якіх імкнуліся вылечыць хваробы. Менавіта дзякуючы гэтым славесным формулам, што выкарыстоўваліся таксама і ў розных абрадах, імкнуліся дасягнуць жаданага выніку. Невыпадкова замовы з'яўляюцца своеасаблівым відам абрадавага фальклору.

Як вядома, яны падзяляюцца на некалькі груп: гаспадарчыя, лекавыя, любоўныя, сацыяльна-бытавыя, ахоўныя ад звяроў і звышнатуральных істот. Практычна тэксты замоў захоўваюцца ў сваёй нязменнай форме, бо ў іх змесце нельга было нічога змяняць, і гэта было звязана з тым, каб не нашкодзіць чалавеку падчас іх выкарыстання.

Валодалі замоўнай творчасцю нешматлікія людзі, якія былі ўпэўнены ў магічнай сіле ўплыву слоў і тых дзеянняў, што іх іншы раз суправаджалі. Верылі ў народзе, што з дапамогай замоў можна як дапамагчы чалавеку, так і нашкодзіць. Носьбітаў гэтага ўнікальнага віду мастацтва называлі "шаптухамі", "чараўніцамі". Варта адзначыць, што замовы адрозніваюцца ад іншых фальклорных жанраў асаблівасцямі структуры, семантыкай, сістэмай вобразаў, сродкамі мастацкай выразнасці. На думку даследчыцы замоўнай творчасці Г. А. Барташэвіч, "слова ў замовах і сродак магічнага ўздзеяння, сродак рэалізацыі закладзенага ў замове пажадання і ў той жа час гэта сродак стварэння магічнага тэксту, магічнай формулы, паэтычнага вобраза" [2, с. 200]. Засяродзім увагу на аналізе лекавых замоў беларусаў.

У структуры замовы можна вылучыць некалькі важных частак, да якіх адносяцца такія, як уводзіны-малітва, зачын, асноўная частка,

закрэпка і заамінаванне. Як правіла, пачынаюцца замовы са звароту да Бога, да Святой Багародзіцы. Менавіта пад уплывам хрысціянства ў іх змесце з’яўляецца кароткі або разгорнуты malітоўны ўступ. “Хрысціянізаваны ўступ можа не мець дачынення да зместу твора, ён даўніна традыцыі” [2, с. 213].

Прывядзем прыклады розных варыянтаў уводзін-малітвы, абапіраючыся на тэксты лекавых замоў, запісаных на тэрыторыі Гомельшчыны: “Госпаду Богу памалюся, мацеры Прачыстай пакланюся, Святая Прачыстая памажы волас уліваць” (замова “Волас уліваць”) [1, с. 23]; “Первым разам, божым часам Госпаду Богу памалюся. Ранняя зарніца, Божая памашніца” (замова “Ад уроку”) [1, с. 64]; “Первым разам, божым часам Госпаду памолімся, Святой Прачыстай паклонімся, святым дзянёчкам васкрасеннем, утрашней зарой” (замова “Ад удару”) [1, с. 159]. Невыпадкова называюцца “Госпад Бог” і “Святая Прачыстая”, бо надзвычай важна было адразу паказаць, да каго звяртаецца чалавек па дапамогу.

У наступнай частцы замовы, якую называюць зачынам, гаворыцца пра дзеянні чалавека, які выконвае рытуал замаўлення: “Іду я не ўліцаю, не дарожкаю, а па пустых перавулках, па канавах, па ярах” (замова “Ад зубной болі”) [1, с. 176].

У асноўнай частцы замоўнай формулы змешчана інфармацыя аб тым, якой менавіта па сутнасці з’яўляецца хвароба, якую трэба лекаваць. Замовы могуць быць ад розных хвароб: ад перапуду, ад каўтуна ў валасах, ад зубнога болю, ад удару і гэтак далей. Звычайна ў гэтай частцы замовы можа ісці размова пра невялікую гісторыю, падобную да казкі, напрыклад: “Ішоў Гасподзь з нябёс з усімі сіламі, святымі апосталамі, з мора ваду змераў, за жалеза голай рукой хапаў, ад (імя) злёкі, урокі, здані, прыстрэкі, прыгаворы адганяў папіны, маміны…” (замова “Іспуг”) [1, с.123]; “Як на моры, на востраве там стаяў дуб на дванаццаць какатоў, пад тым дубам сядзела тры дзевіцы. Адна – шыла, другая – вышывала, а трэця – нічога не рабіць, а рабу Божаму (імя) спуг гаварыць…” (замова “Спуг”) [1, с. 125].

Завяршаецца замова закрэпкай, што надае статус абавязковасці сказанаму, і вымаўленнем слова “Амінь”, напрыклад: “Я – словам, а Бог – з помашчу. Амінь” (замова “Іспуг”) [1, с. 124]. Як адзначыла Г. А. Барташэвіч, “закрэпкі павінны замацаваць тое, што выказана як галоўнае пажаданне, таму ў іх пераважае матыў замыкання, матыў замка” [2, с. 214], напрыклад, “Хай маім зубам і языку будзе ключ” [1, с. 82].

У пераважнай большасці лекавых замоў, запісаных на Гомельшчыне, сустракаецца закрэпка ў выглядзе розных варыянтаў наступнай кароткай формулы: “Госпадзі, палюбі мой дух” (замова “Ад залатніка”) [1, с. 197].

Варта падкрэсліць, што многія лекавыя замовы суправаджаліся пэўнымі дзеяннямі, такімі, як акрапленне хворага святой вадой, піццё святой вады і інш. Звернемся непасрэдна да асобных тэкстаў замоў, напрыклад, замовы “Ад ліхога вока”: “*Умывала дзяцей цераз рэшата, прыгаворваючы пры гэтым*: «Як вада на рэшаце не дзержыцца, так бы не дзяржаліся на рабе Божай (імя) ні ўрокі, ні крыксы, ні празоры, ні перапалохі»” [1, с. 93].

Прыведзеная замова з’яўляецца абаронай ад негатыўнага ўплыву, выкліканага зайздрасцю ці зласлівымі думкамі. Іншы раз выка-рыстоўвалі пэўныя прадметныя атрыбуты ў якасці абярэгаў, напрыклад, дзецям надзявалі крыжык на шыю ці чаплялі мяшочак з асвячонай соллю, прышпільвалі шпільку да адзення (навыварат), завязвалі чырвоную нітку на руку. “Зурока”, паводле сведчанняў інфармантаў, была небяспечнай тым, што чалавек пачынаў або цяжка хварэць, або яго суправаджалі няўдачы. Лічылася ў народзе, што той, каго “зурочылі”, “пачынае сохнуць”.

Іншы раз замову ад спуду чыталі, выкарыстоўваючы асвячоную ў царкве ваду: “*Загаворвала тры разы на ваду і брызгала дзіця і яго пасцель тры дня падрад*: «Святой Спасіцель, Іван Крэсціцель на парозе стаяў, кнігі пісаў, вадзіцу асвяшчаў, к рабу Божаму (імя) падступаў. Той вадой раба Божая (імя) прамывала, іспуг ў яго сні-мала. Амінь»” [1, с. 123]. Спуд у дзяцей – распаўсюджаная з’ява. Звычайна ён суправаджаецца празмернай трывожнасцю, гіперактыўнасцю, недамаганнямі і стомленасцю немаўляці. Над калыскай дзіцяці таксама вешалі абраз Багародзіцы, каб яна бараніла дзіця ад уздзеяння злых сіл.

Замовы часта вымаўляліся падчас родаў, каб аблегчыць пакуты жанчыны-парадзіхі і, у крайнім выпадку, выратаваць жыццё дзіцяці або самой маці: “Ішла Божая Маці меднай гарой, несла ключы за сабой, цэркаў атмыкала і рабу Божаю адмаўляла, і младзенца на свет белы выпускала. Амінь” [1, с. 267]. Такімі словамі бабка-павітуха адпужвала злых духаў, якія з’яўляліся пры нараджэнні “чыстага”, “безгрэшнага” немаўляці.

Такім чынам, замовы – неад’емная частка жыцця нашых продкаў. З імі ў даўніну пачыналася жыццё чалавека, і з імі ж яно завяршалася. Яны былі скіраваны на дапамогу і абарону ад хвароб,

злых духаў. Імі лекавалі, ратавалі, суправаджалі на той свет. Лекавыя замовы з’яўляюцца найкаштоўнейшым відам народнага мастацтва, з дапамогай якога можна больш глыбока зразумець лад жыцця нашых продкаў, спасцігнуць асаблівасці светапогляду.

## Спіс літаратуры

1 Гаючае слова роднай зямлі : беларускія лекавыя замовы / аўтар уступнага артыкула, аўтар-укладальнік Вяргеенка С. А. – Гомель: Барк, 2013. – 340 с.

2 Беларусы. Т. 7. Вусная паэтычная творчасць / Г. А. Барташэвіч, Т. В. Валодзіна, А. І. Гурскі і інш.; Рэдкал.: В.М. Бялявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 586 с.